УДК [39:316.7+2](476.7)

# ЦАРКВА І РЭЛІГІЯ Ў ШТОДЗЁННЫМ ЖЫЦЦІ СЯЛЯН БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ Ў 1930–1940-я гг. (на прыкладзе вёскі Балоты Кобрынскага раёна)

**Ігнацюк Аляксандра Аляксандраўна**
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна (г. Брэст, Беларусь)

*У артыкуле разглядаюцца ўплывы царквы і рэлігіі на штодзённасць сялян Берасцейшчыны ў 1930–1940-я гг. Даследаванне грунтуецца на палявых матэрыялах, сабраных аўтарам у в. Балоты Кобрынскага раёна.*

Штодзённае жыццё сялян даволі цесна звязана з рэлігіяй і царквой. Вялікую ролю тут адыгрываюць традыцыі, якія замацаваліся з даўніх часоў. Цяжка ўявіць сялянскую сям'ю, якая б не адзначала царкоўныя/каляндарныя святы, бо ад гэтага залежалі ўпарадкаванне працы і арганізацыя адпачынку селяніна. Каб лепш разумець жыццё вясковых людзей у розныя гістарычныя перыяды і іх светапогляд, неабходна разгледзець пытанне месца і ролі царквы і рэлігіі ў іх штодзённасці.

Вёска Балоты Кобрынскага раёна знаходзілася ў складзе Польшчы ў перыяд 1921–1939 гг. [8, с. 121]. Разам з тым, у вёсцы існавала 2 праваслаўных храма: царква Раўнаапостальскай Марыі Магдалены і царква Святой Параскевы Пятніцы [9, с. 11]. З 1882 г. ў вёсцы Балоты дзейнічала царква Святой Параскевы Пятніцы. Яна ўзводзілася на месцы старога храма, які вядомы па крыніцах з 1652 г. [10]. На перыяд будаўніцтва новага будынка было вырашана ўзвесці ча-



Электронный архив библиотеки имени А. А. Кулешова

совую царкву для багаслужэнняў, якая была асвечана ў гонар Раўнаапостальнай Марыі Магдалены [9, с. 11]. Часовы храм быў пабудаваны з дрэва. Дах будынка быў накрыты гонтам. Царкву вянчалі два купалы [2]. У 1930-я гг. з-за адсутнасці належнага дагляду, дах будынка працякаў, дрэва гніло, сцены будынка былі чорнымі: *Царква була ны крашана, то стоела чорна. І в сырэдыні було там повночы* [3]. Пры польскай уладзе ў храме царкоўныя служэнні не адбываліся, за выключэннем адпявання нябожчыкаў. [1, 2]. Падчас Вялікай Айчыннай вайны з-за аварыйнага стану храм быў увогуле зачынены [9, с. 11]. Богаслужэнні праводзіліся ў храме Святой Параскевы Пятніцы, які сярод сялян называўся "новай царквой".

Наведванне царкоўнай службы вясковымі жыхарамі адбывалася кожную нядзелю і ў рэлігійныя святы. Перад богаслужэннем народнай традыцыяй забаранялася есці [3]. Асаблівая ўвага надавалася знешнему выгляду прыхаджан: усе павінны былі быць у чыстым адзенні, а жанчыны абавязкова з галаўным уборам: *"Моя мама колыся на хуторі тылушкам дасть, свынэй покормыть, йісты наварыть і вжэ ногы мые. Помыла ногы, завоі зав'е. Колыся ходылы в цэркву, то біленькы зав'ють, подвежуть"* [6]. Кожны хрышчаны чалавек абавязкова насіў нацельны крыжык [6]. Рэлігійныя абрады праводзіліся і дома. Абавязкова ранкам маліліся ўсе члены сям'і. Таму ўжо з маленькага ўзросту дзяцей вучылі малітвам: *"Рано всі вісталы, поумывалыся. Дід заставляв молытыся. Нас поставыть з братом, дід молыться, а мы повторяемо за ім. І каждый пойшов по своей роботе"* [3]. Веданне малітвы правяралася ў дзяцей. Так, маленькія члены сям'і павінны былі вывучыць "Ойча Наш" і расказаць бацькам. Хто ўсё вывучыў, мог маліцца асобна [6].

У 1930-я гг. значная ўвага рэлігійнаму выхаванню дзяцей надавалася ў школах. Так, у польскі час у вёсцы было некалькі невялікіх школ. Сюды прыязджалі святары, якія раз у тыдзень вялі ўрокі багаслоўя дзецям. У памяшканні абавязкова віселі крыжык і ікона. Напачатку занятку дзеці разам са святаром маліліся Богу: *"А молітва такая: «Духу свенты, сэрца і умыслы нашэ, додай нам охоты, шчобы нам була наука для нас пожычна"* [5]. Падчас ўрока дзеці вывучалі малітвы. Абавязкова ўсе павінны былі ведаць "Ойча Наш". Разам з гэтым дзеці чыталі царкоўныя кнігі, якія прыносіў святар. Галоўным чынам вывучалася Біблія [2].

Рэлігійных абрадаў жыхары вёскі прытрымліваліся і падчас працы. Пасеў, касьба, збор ураджаю – любая сельскагаспадарчая работа селяніна пачыналася «з Хрыстом»: *Мы казалы "Господі, Іісусе Хрысте, помілуй мя грешного". Пэрэхрыстымся, тогді ідэмо у поле жеты, копаты"* [6]. Калі пачынаўся пасеў зернявых культур, то асвячонае зерне змешвалі са звычайным, каб быў лепшы ўраджай [3]. Па вясне, калі выганялі кароў пасвіцца у поле, пастух абыходзіў статак з асвячонай вярбой, каб жывёліна была здаровая і не ўцякала. З падобнай мэтай той жа вярбой гаспадар мог пастукаць па сваёй карове [4]. У нядзелю і, асабліва, у вялікія царкоўныя святы любая праца забаранялася. У гэтыя дні чалавек павінен быў наведваць царкву і маліцца. *"Но то і в веры сказано: "В воскресенье не робыты. Шэсть дній дела, а сыдьмый Богу"* [6]. Невыкананне гэтых правілаў, па ўяўленню сялян, магло прывесці да пакарання ад Бога [6].

З уключэннем тэрыторыі Берасцейшчыны ў склад БССР ў 1939 г. сітуацыя змянілася [8, с. 121]. Антырэлігійная палітыка кранула амаль усе сферы жыцця

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сялян. У 1940-я гг. наведванне царкоўных служэнняў, удзел у рэлігійных абрадах (вянчанне, хрышчэнне) не падтрымліваліся дзеючай уладай. Гэта, напрыклад, перашкаджала селяніну працаваць у калгасе: *"Як будэш вынчетыся, то ны дадуть работаты на тракторе"* [3]. Разам з тым, забаранялася насіць нацельныя крыжыкі. Гэтага правіла вымушаны былі трымацца дзеці, што хадзілі ў школу, і дарослыя людзі, якія працавалі у калгасе і іншых установах [3]. Нягледзячы на гэта, людзі тайна вянчаліся і хрысцілі дзяцей, але ўжо не ўсе.

Змены адбыліся і ў школьнай адукацыі. З прыходам савецкай улады заняткі са святаром у школах былі адменены [2; 5]. Падчас Вялікай Айчыннай вайны школы ў вёсцы не працавалі, зноў яны пачалі дзейнічаць пасля вайны. З 1946 г. была адкрыта новая школа [7]. Вучняў строга кантралявалі настаўнікі. Наведванне богаслужэнняў, асабліва дзецям, забаранялася: *"После войны шэ мы ходылы в цэрковь в 4 классе, а потом ужэ Ніна Павловна, хто ходыв до сповыды, то вжэ ходыла и казала: "Встань!". Раиса Денисовна Парфенюк, учительница, то жэ в 4 классе давала дісцыплиіну і ны пускала"* [6].

Такім чынам, царква і рэлігія займалі значнае месца ў штодзённым жыцці сялян у 1930–1940-я гг., але 1939 г. з'яўляецца пэўнай мяжой: праявы рэлігійнай штодзённасці сялян маюць адметнасці у першай і другой частках азначанага перыяду. Ужо з малога дзяцей выхоўвалі ў праваслаўных традыцыях. Асаблівая ўвага звярталася на веданне малітваў. Абавязковым лічылася наведванне царкоўнай службы ў нядзелю і вялікія рэлігійныя святы. Кожны, хто быў хрышчаны ў дзяцінстве, насіў нацельныя крыжыкі. Выкананне гэтых канонаў сялянамі служыла іх рэлігійнай ідэнтыфікацыі. Абрады былі цесна звязаны з сельскагаспадарчай працай, а святы ўплывалі на адпачынак вясковых жыхароў. Сітуацыя змянілася з прыходам савецкай улады. У школах пачынаецца антырэлігійная праца з дзецьмі, а дарослыя маглі пазбавіцца працы і набыць праблемы з-за сваіх поглядаў. Тым не менш, зыходзячы з аналізу палявых матэрыялаў, многія сяляне працягвалі верыць у Бога і наведваць царкву.

## Літаратура


1. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Ігнацюк М.Г., 1941 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2022.
2. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Ігнацюк Я.І., 1934 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2021.
3. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Курышка А.М., 1936 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2022.
4. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Кіслюк Н.С., 1948 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2021.
5. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Левая С.А., 1926 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2021.
6. Асабісты архіў аўтара. Інтэрв'ю з Шварко А.Ц., 1936 г. н. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, в. Балоты, 2022.
7. Асабісты архіў аўтара. Палявы дзённік А.А. Ігнацюк за 2021 палявы сезон. – Брэсцкая вобл., Кобрынскі р-н, 2021.
8. Гарады і вёскі Беларусі: Энцыклапедыя ў 15 тамах. Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць / Рэдкалегія: Г. П. Пашкоў (галоўны рэдактар) і інш. – Мінск : БелЭн, 2007. – 608 с.
9. Марчук, Н. Храм на Поповой горке. «Болотная церковь» / Нина Марчук // Кобрин-информ. – 2015. – 2 апреля.
10. Плиско, Н. М. Кобрин: Историко-экономический очерк / Н. М. Плиско, Л. Р. Козлов. – Минск : Полымя, 1987. – 96 с.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова